УДК 631.115.8(476)

У. Р. ГУСАКОЎ

ВЫЗНАЧЭННЕ ШЛЯХОЎ І ФОРМ РАЗВІЦЦЯ КААПЕРАТЫЎНЫХ ГАСПАДАРАК

Кааператыўнае сельскагаспадарчае вытворчае прадпрыемства пабудавана на падставе злучэння сродкаў вытворчасці і матэрыяльных рэсурсаў удзельнікаў гэтай арганізацыі (фізічных асоб, сямейных сялянскіх гаспадарак, таварыстваў, калектыўных гаспадарак і інш.). Гэта неабходна для сумеснага больш эфектыўнага вырабу прадукцыі, яе перапрацоўкі і рэалізацыі, набыцця сродкаў вытворчасці, развіцця вытворчай інфраструктуры, выпрацоўкі і правядзення сумеснай аграрнай палітыкі. Формы злучэння (кааперацыі) могуць быць рознымі: аб'яднанне вытворчых магутнасцяў, інтэграцыя працы і стварэнне адзінага і

непадзельнага гаспадарчага механізма без уліку мінімальна неабходнай долі ўзносу кожнага ўдзельніка (інтэграванае прадпрыемства); аб'яднанне розных наяўных памераў сродкаў і рэсурсаў з улікам першапачатковага ўзносу ў выглядзе паяў або доляў і пры ўмове захавання першапачатковай велічыні ўзносаў у іх колькасна нязменным выглядзе пры далейшай інтэграванай вытворчасці (паевае і долевае таварыства); аб'яднанне выключна аднолькавых або фіксіраваных доляў першапачатковых узносаў пры захаванні гэтай велічыні ў нязменным выглядзе за кожным удзельнікам прадпрыемства ў працэсе далейшай сумеснай гаспадарчай дзейнасці (сумеснае прадпрыемства); злучэнне аднолькавых або розных першапачатковых узносаў пры ўмове павелічэння зыходных велічынь на пэўны працэнт ад сумы атрыманага ў працэсе гаспадарання прыбытку (акцыянернае таварыства); укладанне сродкаў у новую або ўжо існуючую вытворчасць пры неабавязковасці далейшага працоўнага ўдзелу ў ёй і інш.

Сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, заснаваныя на кааператыўнай форме ўласнасці, могуць функцыянаваць у трох асноўных выглядах: а) калектыўнае прадпрыемства з калектыўнай формай уласнасці як новае юрыдычнае ўтварэнне са стратай прававога значэння папярэдніх вытворчых функцый і абавязкаў яго ўдзельнікаў; б) сумесная гаспадарка (часовая або пастаянная) з індывідуальна-долевай формай уласнасці пры захаванні права юрыдычнай асобы прадпрыемствамі-ўдзельнікамі і асноўных вытворчых функцый фізічнымі асобамі (шляхам аб'яднання толькі некаторых функцый і аперацый); в) прадпрыемства з калектыўна-індывідуальнай (або прыватнай) формай уласнасці як новае юрыдычнае фарміраванне пры захаванні папярэдніх статуса і правоў удзельнікаў (сумесная вытворчасць, створаная на долевых пачатках, якая атрымала самастойнасць).

Сельскагаспадарчыя кааператывы ў сучасных умовах могуць узнікаць рознымі шляхамі. Першы шлях — гэта трансфармацыя цяперашніх калгасаў і саўгасаў у кааператывы гарызантальнага тыпу. Члены такога кааператыву з'яўляюцца ўласнікамі сродкаў вытворчасці, прадукту калектыўнай працы і даходаў; кіраўніцтва ажыццяўляецца на дэмакратычных прынцыпах дэлегіравання ўлады знізу ўверх. Наогул, кааператыў з'яўляецца незалежнай, самакіраўнічай гаспадарча-разліковай арганізацыяй.

Стварэнне такіх кааператываў часта абумоўлена надзяленнем іх членаў доляй маёмасці і зямельнымі ўчасткамі (напрыклад, па душавой норме і працоўнаму ўкладу ў грамадскую гаспадарку за гады працы). Вызначэнне ўкладаў членаў буйных калектыўных гаспадарак у стварэнне вытворчых фондаў, відаць, набывае эканамічны сэнс. Яно накіравана на аднаўленне персаніфікаванай уласнасці на маёмасць, развівае гаспадарскія адносіны працаўнікоў да калектыўнай уласнасці, ператварае членаў прадпрыемстваў у сууласнікаў, дапаўняе асабістую эканамічную зацікаўленасць пачуццём адказнасці за ўмацаванне грамадскай вытворчасці. Разам з тым замацаванне за членамі калектыўных гаспадарак надзельнай зямлі немэтазгоднае. Калі надзелы вызначыць у натуры, то гэта выкліча ўзнікненне складанай сістэмы землеўпарадкавання, церазпалосіцу, частыя зямельныя пераразмеркаванні, цяжкасці ў грамадскай вытворчасці. Замацаванне ж за членамі калектыву некаторай абстрактнай плошчы (замест фактычнага зямельнага ўчастка) мала што зменіць у традыцыйных вытворчых адносінах і рэальна не паўплывае на эканамічныя вынікі ўнутры прадпрыемства.

Такім чынам, гарызантальны кааператыў не патрабуе ў структуры калектыўнага ўладання абавязковага зямельнага паю членаў. Аднак у выпадку выхаду работнікаў з сістэмы калектыўнай гаспадаркі і заснавання ўласнага прадпрыемства павінны быць прадугледжаны прававыя гарантыі надзялення зямлёй, для чаго зусім не патрэбна наяўнасць першапачатковага замацавання за імі надзелаў.

Ператварэнне сучасных грамадскіх гаспадарак у кааператывы ўскладняецца іх велізарнымі памерамі: у сярэднім па рэспубліцы ў адным калгасе занята 417, у адным саўгасе — 367 чалавек. У такіх калектывах практычна вельмі цяжка арганізаваць сістэму гаспадарання па тыпе прамой дэмакратыі. Прымальная структура кіравання ўнутры буйнога гарызантальнага кааператыва патрабуе стварэння спецыфічнага матывацыйнага механізма, які спалучае індывідуальную і агульнагаспадарчую зацікаўленасць. Пры вялікай колькасці працаўнікоў калектыўныя вынікі вытворчасці апасродкавана залежаць ад індывідуальных намаганняў кожнага, каардынацыі вытворчых функцый і аперацый, кантролю за работамі і тым самым яны шмат у чым губляюць сваё стымулюючае ўздзеянне.

Такім чынам, пры трансфармацыі традыцыйных калгасаў і саўгасаў у кааператыўныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы патрэбна руплівая падрыхтоўчая праца: вызначэнне памеру, саставу і функцый першасных падраздзяленняў і працоўных калектываў, наладжванне эфектыўных сувязяў, выкарыстанне дзейснай сістэмы стымулявання, высокая адказнасць за абавязкі, надзейнасць дагаворных або кантрактных узаемаадносін і г. д. Напэўна, у структуры сельскагаспадарчых кааператыўных аб'яднанняў такога тыпу ўзнікнуць самастойныя кааператыўныя арганізацыі і сялянска-фермерскія гаспадаркі па канкрэтных напрамках вытворчасці, якія, дасягнуўшы пэўнай ступені эканамічнага станаўлення, стануць дамагацца юрыдычнай незалежнасці.

Другі шлях — утварэнне дробнагрупавых сельскагаспадарчых кааператываў (таварыстваў, арцеляў, сучасных гаспадарак). Па сутнасці, дробныя кааператыўныя арганізацыі таксама ўяўляюць сабой разнавіднасць калектыўных гаспадарак. Але калі ў першым выпадку яны з'яўляюцца вынікам пераўтварэння на кааператыўных пачатках ужо існуючых буйных грамадскіх прадпрыемстваў, то тут невялікая група людзей, якія дамовіліся паміж сабой (падабраліся па кваліфікацыі, зацікаўленасці, мэтах і інш.), на ўзятых у калектыўнае карыстанне або ў арэнду зямлі і вытворчых памяшканнях утварае новую гаспадарку.

Але галоўнае заключаецца не ў спосабе стварэння гаспадаркі і не ў яе памерах. Выразнай асаблівасцю дробнагрупавых кааператываў з'яўляецца іх арганізацыйная мабільнасць, прыстасаванасць да ўмоў гаспадарання, арыентацыя на рынак і запатрабаванні спажыўцоў, адзінства мэтаў, згуртаванасць, зацікаўленасць у высокіх канчатковых выніках. Аднак дробнагрупавыя кааператывы практыкуюць пераважна непрацяглыя па тэрмінах гаспадарчыя дагаворы (большасць іх заключаецца не больш чым на пяць гадоў) і адносна часта разбураюцца і трансфармуюцца ў самастойныя сялянска-фермерскія гаспадаркі. Асноўнай прычынай параўнальнай няўстойлівасці дробнагрупавых калектываў з'яўляецца ўскладненне асабістых адносін іх удзельнікаў у сувязі з узмацненнем агульнага эканамічнага стану гаспадарак.

Імкненне працаўнікоў да аб'яднання ў малы сельскагаспадарчы калектыў абумоўлена складанасцю гаспадарання як у буйной, так і індывідуальнай гаспадарцы. Гэта недахоп сродкаў, адсутнасць адпаведнай тэхнікі, неўладкаванасць грамадскай гаспадаркі, адсутнасць вопыту і навыкаў індывідуальнай прадпрымальніцкай працы. Невялікі згуртаваны творчы калектыў можа сам размяркоўваць сродкі вытворчасці і прадукты працоўнай дзейнасці; яму лягчэй дзейнічаць у адпаведнасці з зацікаўленасцю кожнага чалавека. У ім хутчэй таксама павышаюцца даходы.

Трэці шлях — фарміраванне кааператыўных гаспадарак па тыпе партнёрства (таварыства). Гэта форма кааператываў можа распаўсюджвацца пераважна ў структуры сялянска-фермерскіх, сямейных, сямейна-сваяцкіх і дробнагрупавых гаспадарак, дзе замест аднаасобнага ўладання практыкуецца раўнапраўнае сууладанне ўсіх пастаянна занятых працаўнікоў. Разам з тым, напэўна, будуць ствараццa каапе-

ратывы і таварыствы, заснаваныя на злучэнні індывідуальных і сямейных сялянска-фермерскіх гаспадарак. Колькасць членаў партнёрстваў або таварыстваў, паводле вопыту замежных краін, можа складаць дваццаць чалавек. У адрозненне ад дробнагрупавых сельскагаспадарчых кааператываў партнёрствы і таварыствы, як і сялянска-фермерскія гаспадаркі, з'яўляюцца даволі ўстойлівай формай гаспадарання. Яны характарызуюцца высокімі эфектыўнасцю і манеўранасцю, фарміруюцца ў асноўным на сваяцкіх адносінах, ствараюцца ў сувязі з неабходнасцю аб'яднання сродкаў, захавання правоў у аднолькавым карыстанні сумеснай маёмасцю і раўнапраўным размеркаваннем даходаў, а таксама адказнасці за вынікі гаспадарання. У некаторых выпадках прычынай можа быць неабходнасць размеркавання прыбыткаў паміж самастойнымі партнёрамі з мэтай памяншэння ставак падаткавых выплат (з індывідуальнай сумы выплаты меншыя, чым з сумарнай), у другіх — спрашчэння парадку спадкаемнасці маёмасці, у трэціх — стварэння асновы для паскарэння працэсу першапачатковага назапашвання капіталу, у чацвёртых — кваліфікаванага і прафесійнага ўзаемадапаўнення працаўнікоў, у пятых — атрыманне правоў партнёра спадкаемцамі, у якіх ёсць магчымасць і жаданне гаспадарыць самастойна пры ўмове немэтазгоднасці вылучэння часткі капіталу для аўтаномнага гаспадарчага ўладкавання.

Чацвёрты шлях — акцыянерныя кааператыўныя прадпрыемствы. Напэўна, гэты падыход будзе найбольш распаўсюджаны ў асяроддзі буйных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў — калгасаў і саўгасаў, якія імкнуцца да кааператыўнай арганізаванасці, а таксама сярод ужо існуючых сельскагаспадарчых кааператываў розных тыпаў. Так, шмат якія калгасы і саўгасы з індустрыяльнай вытворчасцю немагчыма і немэтазгодна падзяляць на шматлікія юрыдычна незалежныя кааператыўныя фарміраванні. У такіх гаспадарках шмат фондаў, не прыстасаваных да выкарыстання ў індывідуальным сектары: буйныя жывёлагадоўчыя комплексы, птушкафабрыкі, магутная і энергаёмістая тэхніка і г. д.

Вырашыць названую праблему магчыма двума спосабамі: 1) пераўтварыць буйныя прадпрыемствы прамысловага тыпу ў кааператыўныя аб'яднанні вытворчых падраздзяленняў, якія базіруюцца на інтэграванай калектыўнай гаспадарцы, без права юрыдычнага адасаблення першасных кааператываў. Аднак для пераадолення арганізацыйнага фармалізму і надання неабходнай зацікаўленасці калектывам падраздзяленняў і наогул у эфектным сумесным гаспадаранні можна падзяліць вытворчыя фонды паміж працаўнікамі, вызначыць парадак долевага ўдзелу членаў у калектыўнай вытворчасці і фарміраваць акцыянерны капітал з улікам яго аднаўлення і выплаты дывідэндаў па выніках гаспадарчай дзейнасці; 2) стварыць кааператыўна-калектыўную або кааператыўна-грамадскую гаспадарку, калі частка падраздзяленняў атрымлівае статус самастойных кааператыўных фарміраванняў, а другая — са сферы буйной грамадскай вытворчасці — працягвае гаспадарыць калектыўна. Але разам яны ўтвараюць аб'яднанне з рознымі формамі ўласнасці і гаспадарання, свабодай арганізацыйных фарміраванняў, эканамічных і інтэграцыйных сувязяў.

Частка падраздзяленняў можа атрымаць юрыдычны статус незалежных кааператываў, але будзе працягваць эканамічнае супрацоўніцтва з іншымі падраздзяленнямі, у тым ліку і з тымі, хто працуе на грамадска-калектыўных пачатках. Аб'яднанне наогул і падраздзяленні паасобку могуць практыкаваць акцыянерную форму ўласнасці і пераразмяркоўваць акцыі паміж грамадскімі, калектыўнымі і кааператыўнымі падраздзяленнямі ўнутры прадпрыемства, фарміруючы тым самым змешаны капітал і ўзмацняючы эканамічныя сувязі і зацікаўленасць. Напрыклад, члены самастойнага кааператыўнага падраздзялення могуць мець акцыі грамадскіх і калектыўных падраздзяленняў і наогул

акцыі сумеснай маёмасці (прадпрыемства), а працаўнікі грамадска-калектыўных фарміраванняў — акцыі аб'яднання і кааператыўных падраздзяленняў.

Пяты шлях — стварэнне сумесных (кааператыўных, долевых, паевых) прадпрыемстваў у галіне вытворчасці, перапрацоўкі і рэалізацыі прадукцыі, забеспячэння рэсурсамі, будаўніцтва, рамонту і г. д. Захоўваючы права юрыдычнай асобы, прадпрыемствы і гаспадаркі (у тым ліку і кааператыўныя) могуць аб'яднаць капіталы, рэсурсы і стварыць сумесныя арганізацыі (з правам і без права наступнага атрымання статуса юрыдычнай асобы, часовыя і пастаянныя) на долевых і паевых пачатках з утварэннем змешанай індывідуальна-прыватна-калектыўнай формы ўласнасці пры ўмовах дэлегіравання ім некаторых сваіх функцый. Даходы гэтых сумесных прадпрыемстваў могуць размяркоўвацца па ступені ўдзелу ў іх стварэнні. Асноўная мэта дзейнасці сумесных гаспадарак — палепшыць умовы функцыянавання прадпрыемстваў-заснавальнікаў, кааперыраваць некаторыя працаёмістыя другарадныя функцыі (якія патрабуюць калектыўнага вырашэння), засяродзіць увагу на якасным выкананні асноўных абавязкаў.

Разгледжаныя тыпы кааператыўных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў з'яўляюцца найбольш верагоднымі ў структуры новага аграрнага механізма, хоць гэтым, зразумела, не вычэрпваецца шматстайнасць кааператыўных формаў гаспадарання. Карыснасць усіх названых форм пацвярджае замежны і айчынны вопыт. Прыхільнасць да гарызантальнай арганізацыі, нескладанасць у кіраванні, поўнае і эфектыўнае выкарыстанне ўнутраных і знешніх магчымасцяў вытворчасці, прыстасаванасць да ўмоў гаспадарання сведчаць пра іх мэтазгоднасць і эфектыўнасць. Пры іх распаўсюджанні знікае неабходнасць радыкальнага разбурэння існуючых структур. На кааператывы названых тыпаў лёгка ўплываюць эканамічныя рычагі рэгулявання вытворчай дзейнасці. Да недахопаў кааператыўнай арганізацыі належыць толькі тое, што калегіяльнасць вырашэння гаспадарчых пытанняў адносна менш рухомая, чым індывідуальная практыка, а неабходнасць узгаднення думак ускладняе прыняцце канчатковых рашэнняў, хоць пры гэтым эфектыўнасць сумесных дзеянняў больш поўна адпавядае зменлівай эканамічнай кан'юнктуры.

Пры ўзмацненні рынкавых адносін выяўляюцца тэндэнцыі да пераходу ад буйных кааператыўна-калектыўных прадпрыемстваў да больш дробных па памерах зямельнай плошчы і аб'ёмах вытворчасці, лепш збалансаваных па рэсурсах. Яны больш поўна ўлічваюць запатрабаванні спажыўцоў і арыентуюцца на ўмовы рынку. Калектыўныя прадпрыемствы, абдзяржаўленыя пад уздзеяннем жорсткага цэнтралізавана-адміністрацыйнага кіравання, вяртаюцца да сваіх зыходных кааператыўных пачаткаў. Побач з гэтым узмацняецца імкненне прадпрыемстваў да кааперацыі і інтэграцыі асобных вытворчых і абслуговых функцый пры захаванні сваёй юрыдычнай самастойнасці. У выніку гэтага з'яўляюцца розныя аб'яднанні, пасрэдніцкія фірмы, асацыяцыі і г. д., якія працуюць на камерцыйных пачатках, накіраваныя ў асноўным на стварэнне больш спрыяльных умоў для вытворчасці асноўным прадпрыемствам.

Асаблівае месца ў сістэме кааперацыі належыць кааператыўнай арганізацыі сялянскіх гаспадарак. Аналіз практыкі сведчыць пра тое, што сялянска-фермерскія гаспадаркі не могуць эфектыўна функцыянаваць, не аб'яднаўшы шматлікіх функцый і работ на кааператыўных пачатках. Не інтэграваўшы ўмоў, яны не здольны вытрымаць спаборнасць і канкурэнцыю з кааперанымі і буйнымі гаспадаркамі за спажыўца і рынкі збыту, мадэрнізацыю гаспадаркі і рэсурсазабеспячэнне, якасць прадукцыі і забеспячэнне неабходнай рэнтабельнасці і г. д.

Даследаванні дазваляюць вызначыць наступную схему развіцця кааперацыі: арганізацыя самастойнай сялянскай або фермерскай гаспадаркі→прымітыўныя віды кааперацыі, калі асноўныя патрэбы сялян

заключаюцца ў набыцці зямлі, тэхнікі і іншых сродкаў, а кааперавание ажыццяўляецца дзякуючы вымушанай залежнасці сялянска-фермерскіх гаспадарак ад існуючай сістэмы гаспадарання, якая па-ранейшаму валодае ўсімі або асноўнымі відамі рэсурсаў і матэрыяльных сродкаў і кантралюе збыт прадукцыі→пераходныя формы, калі сялянска-фермерскія гаспадаркі аб'ядноўваюцца паміж сабой для аховы сваіх правоў у забеспячэнні рэсурсаў, перапрацоўцы і збыце вытворчай прадукцыі→развіваюцца формы, калі назіраецца працэс дыферэнцыяцыі і спецыялізацыі сялянскіх гаспадарак унутры ўтвораных аб'яднанняў→развітыя формы, калі аб'яднанне сялянска-фермерскіх гаспадарак адбываецца па прадукцыйным тыпе (саюз, асацыяцыя або аб'яднанне вытворцаў малака, сыру, масла, мясных вырабаў і г. д.), у сувязі з чым сумеснымі намаганнямі ажыццяўляецца паглыбленая перапрацоўка і пастаўка на рынак аднаго або некалькі асноўных прадуктаў і адпаведна фарміруецца спецыялізацыя матэрыяльна-тэхнічнай базы таваравытворцаў→вышэйшыя формы, калі ўтвараецца незалежная і аўтаномная сістэма гаспадарання, пачынаючы ад забеспячэння рэсурсамі (уключаючы іх частковую вытворчасць) да перапрацоўкі і рэалізацыі прадукцыі, што характарызуе сабой усю вытворча-эканамічную інфраструктуру (малы сектар аграрнай эканомікі). Сюды могуць уваходзіць не толькі сялянскія гаспадаркі і кааператывы, але і асацыяцыі, саюзы, аб'яднанні, фірмы, камбінаты і інш.

Цяперашняму этапу развіцця сялянскай кааперацыі ў нашай рэспубліцы ў некаторай ступені адпавядаюць тры першыя яе формы. Так, паўсюдна адбываецца станаўленне самастойных гаспадарак. Але яны залежаць ад існуючых кіраўніцка-бюракратычных структур і манапольнай сістэмы калгасна-саўгаснай вытворчасці. Атрыманне зямлі, матэрыяльна-тэхнічных сродкаў і рэсурсаў залежыць ад суб'ектывісцкіх рашэнняў мясцовых органаў кіравання, а рэалізацыя прадукцыі ажыццяўляецца ў асноўным на ўмовах арэндадацеляў, пастаўшчыкоў рэсурсаў і матэрыялаў. Толькі ў некаторых рэгіёнах (напрыклад, Прыбалтыйскім) кааперавание ўступіла ў стадыю пераходных формаў развіцця: незалежныя гаспадары аб'яднаны ў самастойныя саюзы і асацыяцыі і арганізуюць забеспячэнне існуючымі рэсурсамі, перапрацоўку і рэалізацыю прадукцыі.

Аднак дзейнасць ні адной рэгіянальнай асацыяцыі пакуль што не адпавядае прынцыпам развітой кааперавання арганізацыі: добраахвотнасці ўступлення ў кааператывы, незалежнасці руху, дэмакратычнасці кіравання, адкрытаму характару арганізацыі. У цяперашніх умовах гэтыя прынцыпы неабходна дапоўніць яшчэ і такімі, як арганізацыя парытэтнага тавараабмену і вольнага гандлю, незалежнасць рэсурсазабеспячэння; эканамічнае і юрыдычнае раўнапраўе ўсіх форм гаспадарання; самастойны выбар партнёраў па кантрактных абавязацельствах; добраахвотнае ўступленне ва ўзаемаадносіны, самастойны выбар каналаў рэалізацыі прадукцыі; самастойнасць гаспадарання, гарантаваная заканадаўствам; адвольныя ўтварэнне і ліквідацыя арганізацый; арыентацыя на паказчыкі аптымальнага гаспадарання.

Характэрна, што гэтыя прынцыпы адпавядаюць міжнародным патрабаванням. Так, асноўнымі прынцыпамі сельскагаспадарчай кааперацыі, як рэкамендуецца Міжнародным кааператыўным саюзам, павінны быць добраахвотнасць уваходжання ў кааператыўныя структуры і іх адкрытасць у адносінах да патэнцыяльных удзельнікаў; дэмакратызм у кіраванні кааператыўнымі прадпрыемствамі (выбарнасць кіраўніцтва, радыкальныя правы ўсіх асоб — членаў сельскагаспадарчых кааператываў), налічэнне працэнтаў па ўкладах удзельнікаў у асноўны капітал кааператыўнага прадпрыемства; размеркаванне прыбытку (страт) паміж удзельнікамі кааперацыі па іх укладу або ў развіццё гаспадарчай дзейнасці кааператыву, або ў абслугоўванне сельскагаспадарчай вытворчасці, або прапарцыянальна аб'ёмам іх вытворчасці ў кааперa-

тыве; садзейнічанне кааператыва павышэнню кваліфікацыі сваіх членаў і ўзроўню іх падрыхтоўкі для працы ў сістэме кааперацыі; супрацоўніцтва кааператываў на рэгіянальным, дзяржаўным і міжнародным узроўнях.

Магчымасці кааператываў, як сведчыць вопыт замежных кампаній, залежаць ад наяўнасці інфармацыі аб становішчы на рынках, узроўню дыверсіфікацыі вытворчасці, каардынацыі банкаўскай працы і іншых фактараў. Высокі ўзровень рыначнай канкурэнцыі актуалізуе для канкрэтных сельскагаспадарчых кааператываў вырашэнне праблемы структурнай перабудовы вытворчасці. Адзначым, што функцыянаванне шматлікіх кааператываў, іх аб'яднанняў і саюзаў за мяжой галоўнай мэтай ставіць стварэнне спрыяльных умоў гаспадарання для сваіх членаў і зусім не заўсёды максімізацыю прыбытку. Маецца на ўвазе, што максімізацыя прыбытку — гэта функцыя капіталістычных прадпрыемстваў і арганізацый, а не кааператыўных.

Вывады

1. Сэнс кааперацыі заключаецца ў тым, каб, не разбураючы першасныя і асноўныя вытворчыя звенні (а менавіта працоўныя сялянска-фермерскія і калектыўныя гаспадаркі), аб'яднаць шматлікія работы і функцыі, зрабіць іх эфектыўнымі.

2. Кааперацыя — гэта саюз, і члены яго застаюцца самастойнымі і юрыдычна незалежнымі.

3. Аб'ядноўваецца толькі тая частка вытворчасці або работ, дзе буйная арганізацыя мае перавагу перад дробнай.

4. Пры развіцці вытворчасці кааперацыі падлягаюць усё новыя і новыя функцыі. Яна перабудоўвае раз'яднаныя гаспадаркі ў вышэйшыя формы грамадскай гаспадаркі.

5. Сялянская кааперацыя не супрацьпастаўленне і падмена існуючай буйной сельскагаспадарчай вытворчасці, а яе дапаўненне. Яна абслугоўвае пераважна працаёмістыя і адсталыя галіны і павышае агульную эфектыўнасць сельскай гаспадаркі і толькі прэтэндуе на раўнапраўе ў сістэме разнастайнасці форм гаспадарання.

6. Кааперацыя грунтуецца на прадпрымальнасці, спаборнасці, рызыцы, і таму поспех справы залежыць ад асобных працаўнікоў, якія спадзяюцца толькі на сваю працу і будуюць сваю дзейнасць на самаакупнасці.

7. Працоўная кааперацыя не прымае вертыкальных структур, якія служаць для ўмацавання адміністрацыйнай распарадчасці, а арыентавана на гарызантальныя аб'яднанні, заснаваныя на партнёрстве, таварыскасці, раўнапраўі, самакіраванні. Такім чынам, эфектыўнасць, рэсурсазберагальнасць, высокая акупнасць з'яўляюцца найважнейшымі крытэрыямі ацэнкі вынікаў сялянскай кааперацыі.

8. Працоўная кааперацыя выключае дармовае інвеставанне, ажыццяўляе ўкладанні за кошт уласных накапленняў, садзейнічае хуткаму ўкараненню прагрэсіўных рашэнняў. Для яе характэрны гнуткасць, мабільнасць, аптымальнасць.

9. Вытворчая кааперацыя з'яўляецца першаасновай развіцця ўсіх відаў і форм сельскагаспадарчай і прамысловай кааперацыі, якія ў цэлым утвараюць інфраструктурны комплекс. Яна выключае манапалізацыю сферы гаспадарчай дзейнасці.

БелНДІ эканамічных праблем АПК

Паступіў у рэдакцыю 22.01.92